Цэван І.М., магістрант ФК і СКД
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Малахава І.А.,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

# АМАТАРСКІЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ КАЛЕКТЫВЫ ЯК З'ЯВА СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

РЕПОЗИТОРИИ БГУКИ

Фальклорнае аматарства, або аматарская творчасць фальклорнага кірунку, як важная грамадска-гістарычная з'ява, на працягу ўсяго часу існавання з'яўлялася сродкам выхавання і мастацка-творчага развіцця асобы. Сацыякультурныя змены, якія адбываюцца ў сучасным беларускім грамадстве, усё вастрэй ставяць пытанне аб месцы і значэнні калектыўнай аматарскай творчасці фальклорнага кірунку ў сучаснай беларускай культуры.

Тэрміналагічная блытаніна на працягу XX ст. прывяла да таго, што ў цяперашні час у беларускай навуцы, практыцы і заканадаўчых дакументах прынята называць "самадзейнае мастацтва", "самадзейную творчасць" тэрмінам "аматарства", "аматарская творчасць", адпаведна самадзейныя калектывы называюць "аматарскімі". Мы, спасылаючыся на сучасных аўтараў і аўтараў мінулага [2;5 і інш.], якія прынцыпова называюць "аматарства" "самадзейнасцю", аўтаматычна выкарыстоўваем першы тэрмін (рускі эквівалент – "любительство"), разумеючы пад ім дзейнасць, якая "працякае ў свабодны час, любімая, цікавая і самакаштоўнасная для яе ўдзельніка" [3, с.22].

Большасць вучоных адзначаюць, што аматарская творчасць, як сацыяльна-культурная і сацыяльна-педагагічная з'ява, характэрызуецца, перш за ўсё, сваёй *арганізаванасцю* (у процілегласць спантанасці) *і арыентацыяй на прафесійнае мастацтва*. На гэтыя абавязковы рысы ўказвалі вучоныя Т.І.Бакланава, А.С.Каргін, У.І.Сітнікаў, А.І.Смірнова, В.С.Цукерман і інш. Сярод некторых вучоных існуе погляд на арыентацыю аматарства на прафесійныя нормы як на негатыўную з'яву. Так, на думку А.Ю.Стральцова, перайманне прынцыпаў прафесійнага мастацтва з'яўляецца адной з праблем

сучаснага аматарства, так як адбываецца скажэнне самой прыроды аматарства. Аўтар адзначае: “Грамадства не здолела знайсці аматарскай мастацкай творчасці праўдзівае, сапраўднае месца і, такім чынам, прымусіла яго “прыбірацца ў чужыя касцюмы”[5, с.163].

*Аматарства фальклорнага кірунку*– асобная з’ява ў культурным жыцці кожнага народа, надзвычай складанае, шматграннае ўтварэнне, часта заблытанае і вольна трактаванае нават аўтарытэтнымі вучонымі, разглядаючы якое, мы не зможам абысціся без катэгорый “фальклор” і “фальклярызм”.

На розных гістарычных этапах тэрмін “*фальклор*” меў розныя значэнні. У сучаснай навуковай літаратуры сустракаюцца тры асноўныя значэнні гэтага тэрміна, пераважае азначэнне фальклору як “комплексу славесных, славесна-музычных, музычна-харэаграфічных, гульнявых і драматычных відаў народнай творчасці”, або больш вузкае азначэнне тэрміну “як мастацтва слова, народнай літаратуры” ці найбольш пашыранае, як “усе віды народнай мастацкай творчасці, уключаючы дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, народнае дойлідства” [1, с.378].

Паняцце “фальклор” разглядаецца ў межах такіх навук, як мастацтвазнаўства, этнаграфія, фалькларыстыка, сацыялогія, культуралогія, псіхалогія і інш. Фальклор разглядаецца ў навуцы і як унутрысітуацыйнае мастацтва (мастацтвазнаўчы падыход), і як мастацкаарганізаванае быццё (сацыялагічны падыход), і як тып культуры, спосаб сцвярджэння ўніверсальнай карціны свету з арыентацыяй на вызначаныя каштоўнасці і сістэмай табу і прадпісанняў (культуралагічны падыход), а таксама як форма калектыўных зносін, як асаблівая творчая актыўнасць, закладзеная ў глыбінях чалавечай псіхікі (псіхалагічны падыход).

Разам з тым, ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы найбольш пераважным з’яўляецца разуменне фальклору, як “формы творчай дзейнасці народных мас, якая сацыяльна абумоўлена і гістарычна развіваецца,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызуецца сістэмай спецыфічных прыкмет (калектыўнасць творчага працэсу як дыялектычнае адзінства індывідуальнай і масавай творчасці, традыцыйнасць, нефіксаваныя формы перадачы твораў, варыятыўнасць, поліэлементнасць, поліфункцыянальнасць) і цесна звязаная з працоўнай дзейнасцю, побытам, звычаямі народа” [1, с.378].

Неабходна адзначыць, што фальклор, як тып мастацкай культуры, сфарміраваўся яшчэ ў сярэднявеччы, у другім адносна нашага сучаснага побыту, ладзе жыцця. Сучасны фальклор ─ гэта рэшткі тагачаснай культуры, якія сёння дзе-нідзе сустракаюцца ў вёсках краіны, дзякуючы памяці сваіх жыхароў. Трансфармацыя ўласна фальклору ў сучасных умовах прывяла да з’яўлення такога тэрміну, як *“фальклярызм”*. Фальклярызм ─ гэта ўзнаўленне фальклорных твораў у іншых (у параўнанні з аўтэнтычнымі) умовах з папулярызатарскай, адукацыйнай ці іншай мэтай; пад “іншымі” ўмовамі звычайна разумеюць адарванасць ад арэальнай, каляндарнай або сітуацыйнай матываванасці, наяўнасць новай функцыянальнай сутнасці.

Аматарскія фальклорныя калектывы звычайна маюць сваю класіфікацыю, прадстаўленую шматлікімі аўтарамі (А.С.Кабанаў, Н.В.Калугіна, І.І.Земцоўскі і інш.). Найбольш абагуленая тыпалогія прадстаўлена Л.Л.Ражковай [4, с. 45-46].

*Этнаграфічныя калектывы* – калектывы, якія ўзнаўляюць фальклор у сцэнічных умовах, але з поўным захаваннем рэпертуару і асаблівасцей лакальнай песеннай традыцыі, з выкарыстаннем усіх уласцівых ёй аўтэнтычных атрыбутаў.

*Народна-акадэмічныя калектывы* – калектывы, дзе работа па навучанні і выканальніцтве падобна на тыя, што склаліся ў межах акадэмічнага (навуковага, прафесійнага мастацтва пісьмовай культуры). А а рэпетыцыйныя заняткі нагадваюць сабой асобны жанр, які своеасабліва сінтэзуе фальклорны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і акадэмічны пачатак.

*Фальклорна-сцэнічныя калектывы* – калектывы, якія ў сваёй дзейнасці спрабуюць адаптаваць творы фальклору да ўмоў сцэны і ў той жа час імкнуцца максімальна захаваць мастацкую стылістыку традыцыйнай творчасці. Сярод калектываў гэтага кірунку знаходзяцца ансамблі, якія выкарыстоўваюць у сваёй дзейнасці адразу некалькі элементаў мастацтва (танец, песню, інструментальнае суправаджэнне) і ансамблі, якія будуюць сваю дзейнасць толькі на нейкім адным элеменце мастацтва. Калектывы фальклорна-сцэнічнага кірунку ў наш час вельмі пашыраны і разнастайны, яны папулярны і іх колькасць складае больш за палову ад уліку калектываў іншых тыпаў. Рэпертуар такіх калектываў, у сваёй большасці, заснаваны на стылізаваных аранжыроўках народных песень, народных мелодый.

Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што сучасныя фальклорныя калектывы адносяцца да з’явы аматарства фальклорнага кірунку і прадстаўленыя этнаграфічнымі, народна-акадэмічнымі і фальклорна-сцэнічнымі калектывамі.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Восточнославянский фольклор: Слов. науч. и нар. терминологии / Редкол.: К.П.Кабашников (отв. ред.) и др.— Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 478с.

2. Григорьева, Е.И. Современные технологии социально-культурной деятельности: Учеб. пособие / Е.И. Григорьева [отв. ред.] — Тамбов: Изд-во ТГУ им. Г.Р. Державина, 2002. - 504 с.

3. Малахова, И.А. Развитие личности: Пособие для педагогов, кл. рук., психологов общеобразоват. шк., педагогов-организаторов внешк. учреждений. В 2 ч. Ч. 2. Художественно-творческая деятельность / И.А.Малахова. — Мн.: Бел. навука, 2003. — 152 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Ражкова, Л.Л. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці падлеткаў сродкамі фальклору ў аматарскіх фальклорных калектывах. / Л.Л.Ражкова. Дыс…канд. пед.навук: 13.00.05.− Мн., 2007. – 144 с.

5. Стрельцов, Ю.А. Культурология досуга: Учебное пособие. / Ю.А.Стрельцов – Изд. 2-е. – М.: МГУКИ, 2003. – 296 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ